Тыдзень беларускай мовы і літаратуры

18 лістапада ў рамках тыдня беларускай мовы і літаратуры ў 5 класе прайшоў прагляд і абмеркаванне мультфільмаў на беларускай мове “Кіназала запрашае”. Шыпуль І.У. для прагляду прапанавала наступныя мультфільмы: “Піліпка”, “Дзедава рукавічка”, “Дзед”. Цікава было прагледзець і мультфільм “У Лукаморья дуб зеленый” на беларускай мове.



19 лістапада вучні 7 класа атрымалі магчымасць палепшыць свае адзнакі па беларускай літаратуры праз перамогу ў гульні “Хто жадае стаць выдатнікам”, якую правяла Шыпуль І.У. Заданні былі складаныя, але многія справіліся. За дапамогай звярталіся так, як і ў сапраўднай гульні: 50/50, дапамога класа, званок сябру. Акрамя вядомых фактаў, якія вучням былі знаёмы з курса літаратуры, яны даведаліся і шмат чаго яшчэ новага пра беларускіх аўтараў і іх творы.






20 лістапада была арганізавана выстава малюнкаў “З’яднайся з прыродай душой”. Юныя мастакі 5, 6, 7 класаў адлюстравалі вядомыя творы беларускіх аўтараў праз свае ўспрыманне прыроды.

Вучні 5 – 11 класаў сталі актыўнымі ўдзельнікамі акцыі “Валянцінка па-беларуску”, якая праходзіла 20 лістапада. Вучні праявілі творчасць і шчыра выказалі ў сваіх работах любоў да свае краіны. Патрыятызм, пашана і гонар за сваю краіну вызначаліся ў кожнай рабоце. Былі прадстаўлены як калектыўныя, так і індывідуальныя работы.